В. І. Краўчанка, дацэнт БДУІР
Я. А. Барысаў, выкладчык БДУІР

# Аб ролі сацыяльна-палітычнай адукацыі ў час пераходу да дэмакратыі

Сацыяльна-палітычная адукацыя ў недэмакратычным грамадстве залежыць ад палітычнай улады і вызначаецца ёю. Яна арыентавана на фарміраванне ўладапаслухмяных людзей, задае зверху ідэалагізаваную палітычную свядомасць, прывівае нецярпімасць да іншадумцаў. Правы і свабоды асобы, прававыя нормы ў палітыцы дэкларуюцца, але апраўяргаюцца практыкай. У выніку фарміруецца ідэалагізаваная, недэмакратычная асоба. Таму механічнае прымяненне дэмакратычных працэдур вядзе да ўсталявання ўлады, якая з'яўляецца люстэркам грамадства.

Дэмакратычныя перамены - не толькі палітычная праблема, яны патрабуюць больш глыбокага культуралагічнага падыходу, фарміравання дэмакратычнай прававой культуры. Якая роля належыць у гэтам сучаснай сацыяльна-палітычнай адукацыі? Само існаванне такіх дысцыплін як сацыялогія і паліталогія з'яўляецца паказчыкам адукацыі грамадства, якое мае намер стаць дэмакратычным. Там адукацыя аўтаномна ад палітычнай улады і пануючай ідэалогіі. Менавіта грамадства дае адукацыі заказ на падрыхтоўку асобы з пэўнымі сацыяльнымі параметрамі. Сацыялогія і паліталогія накіраваны на развіццё асобы, даюць ёй веды, якія дапамагаюць зразумець грамадства і сваё месца ў ім, вызначыць свае палітычныя інтарэсы, паказваюць, як іх рэалізаваць. Таксама яны вучаць, што шлях да гэтага праз выкананне абавязковых для ўсіх правіл, павагу да правоў асобы, поглядаў іншых і цярпімасць да іх. Таму коратка можна сфармуліраваць задачу сацыялогіі і паліталогіі ў тэхнічнай ВНУ, як выхаванне грамадзяніна, асобы дэмакратычнага грамадства.

Калі ў дэмакратычным грамадстве выхаванне грамадзяніна ёсць натуральны працэс узнаўлення існуючых каштоўнасцей і нормаў паводзін, то ў пераходным грамадстве абаперціся на свой вопыт часта немагчыма. Ідзе як бы працэс стварэння ідэальнага тыпу - «як павінна быць». Прыкладам з'яўляюцца дэмакратычныя дзяржавы, якія наглядна дэманструюць сваю эфектыўнасць і перавагу. Задача выхавання простага грамадзяніна не менш важная, чым падрыхтоўка спецыяліста. Апытанні паказваюць, што

большасць студэнтаў таксама лічыць, што вышэйшая адукацыя павінна даць веды не толькі па спецыяльнасці, але і павысіць культуру, у тым ліку палітычную.

Зразумела, больш студэнтаў мае пэўную палітычную культуру на аснове папярэдняга вопыта. Прычым, узровень яе нават вышэй, чым ў многіх сацыяльных катэгорый. Сацыяльна-дэмакратычныя асаблівасці студэнтаў вызначаюць агульныя праявы ў палітычных паводзінах: крытыцызм (недавер да аўтарытэтаў і ўладных інстытутаў); інтэлектуалізм (найбольшы рэйтынг ў палітыкаў-інтэлегентаў); рацыяналізм і прагматызм (перавага практычнай выгады перад ідэалагічнымі каштоўнасцямі). Сацыяльны вопыт выклікае і значныя адрозненні ў палітычнай культуры студэнтаў. Асабліва сказваецца месца жыхарства (горад ці веска), сацыяльны статус сям'і. Стыхійнае фарміраванне палітычнай культуры робіць даволі распаўсюджанымі недэмакратычныя праявы. Захоўваюцца некаторыя стэрэатыпы аўтарытарнай палітычнай свядомасці. Так, абсалютызуецца роля кіраўніка дзяржавы (павінен быць адзін гаспадар, які ўсе можа і ўсім кіруе), ігнаруюцца прававыя формы рэгулявання ўлады, палітычныя правы і свабоды грамадзян. Водгукам таталітарнага грамадства з'яўляецца абсалютызацыя класавага падыхода у палітыцы, канфрантацыя і нецярпімасць да іншадумцаў (улада вырашае патрэбы простага народа, меншасць павінна падпарадкавацца волі большасці). Хаця ўлада найперш выконвае функцыі ўсяго грамадства і павінна аб'ядноўваць народ. Ёсць праявы і іншага плану. Некаторыя шчыра лічаць, што дзеля справядлівых мэт, у тым ліку дэмакратыі, магчымы неправавыя дзеянні, правы і свабоды разглядаюць у адрыве ад абавязкаў перад грамадствам і дзяржавай, што вядзе да прававога і нацыянальнага нігілізму.

Перад вывучэннем сацыяльна-палітычных дысцыплін вымяралася цэласнае стаўленне студэнтаў да палітыкі. выкарыстоўвалася методыка, якую прапанаваў Е. Вятр. Студэнты ацэніваліся па 6 параметрах: інтарэс да палітыкі, інфармаванасць, тэарэтычныя веды, наяўнасць сваёй пазіцыі, дэмакратызм і правая свядомасць, удзел у палітыцы.

Сярод вызначаных 6 тыпаў найбольш распаўсюджаны аналітычны, палітычна пасіўны, кампетэнтны крытык і назіральнік, аднолькавыя прыклады тыпа актывіст і грамадзянін. Найбольш цікавіць нас апошні тып, бо фарміраванне грамадзяніна

вызначана як прыкладная задача сацыяльна-палітычнай адукацыі. Вядучымі паказчыкамі гэтага тыпа з'яўляюцца:

1) наяўнасць пазіцыі, якая заснавана на разуменні сваіх карэнных інтарэсаў і інтарэсаў грамадства, умоў для іх рэалізацыі;
2) дэмакратызм і высокая прававая культура - веданне законаў і паводзіны строга ў іх межах, павага да правоў асобы, плюралізм і талерантнасць. Інфармаванасць, цікавасць, веды на даволі высокім узроўні, але яны не з'яўляюцца самамэтай і хутчэй ляжаць у фундаменце пазіцыі і культуры. Удзел у палітыцы найперш выклікаюць такія матывы, як абарона правоў і свабод асобы, незалежнасць і бяспека краіны, і ў другую чаргу - непасрэднае змаганне за палітычную ўладу.

Якім жа чынам сацыяльна-палітычная адукацыя, асноўным сродкам якой з'яўляюцца веды, зможа выканаць сваю задачу? Найперш трэба імкнуцца да таго, каб сацыяльна-палітычныя веды сталі інструментам пазнання, а не сумай абстрактных паняццяў, завучаных, а потым забытых. Сацыяльна-палітычныя веды будуць запатрабаваны, уключаны ў жыццевы працэс, калі кожны зразумее залежнасць ад палітыкі, ад дзеянняў палітычнай улады. Гэта пачынаецца з простага прагматызму: «Што гэта значыць для мяне?». Наступны крок - фарміраванне палітычнага інтарэса, калі ўзнікае разуменне таго, якія дзеянні ўлады і наогул якая ўлада патрэбна для стварэння спрыяльных умоў па рэалізацыі карэнных інтарэсаў. Каб не быць аб'ектам маніпуляцыі ўлады, а самому мэтанакіравана і эфектыўна ўздзейнічаць на палітыку, неабходна авалодваць грунтоўнымі сацыяльна-палітычнымі ведамі. Для прыняцця рашэнняў недастаткова тэарэтычных ведаў, разумення сваіх інтарэсаў, патрэбна аб'ектыўная і поўная інфармацыя. Студэнтам добра вядомы кошт гэтага тавара у сучасным грамадстве, не меншую вартасць для асобы мае сацыяльна-палітычная інфармаванасць. Такім чынам, толькі адзінства трох фактараў дазволіць дакладна вызначыць кожнаму сваю пазіцыю ў палітыцы, якая найбольш адэкватна адлюстроўвае яго карэнныя інтарэсы.

Другі накірунак сацыяльна-палітычнай адукацыі - выхаваўчы: фарміраванне дэмакратычных прынцыпаў і прававой палітычнай свядомасці студэнтаў. Перавод ведаў аб дэмакратычных прынцыпах і законах у перакананні залежыць ад

сфарміравання патрэбы іх выконваць. Шлях той жа - праз рацыянальнае асэнсаванне аптымальных умоў для рэалізацыі асабістага інтарэса.

Балючай для нас застаецца праблема прававога рэгулявання дзейнасці ўлады. Неабходна пераадольваць ілюзіі наконт таго, што дэмакратычныя прававыя нормы могуць перашкаджаць эфектыўнай дзейнасці палітычнай улады. Аматарам моцнай улады трэба даводзіць, што адсутнасць прававога рэгулявання, ці законы, якія не ствараюць прававыя рамкі дзейнасці ўлады, вядуць да ўседазволенасці, безадказнасці і гвалта, ад якога не застрахаваны ніхто, нават з ліку простых грамадзян. Законапаслухмянасць павінна быць нормай паводзін кожнага чалавека. Але калі ў недэмакратычным грамадстве яна заснавана на пасіўным успрыняцці прававых норм, то у дэмакратычным - на свядомым іх выкананні і патрабаванні рабіць гэта ўсімі, у тым ліку і палітычнай уладай. Таму дэмакратычнае грамадства характарызуецца прававой актыўнасцю. Прыклады ёсць ужо і ў нас - дзейнасць грамадскіх праваабарончых арганізацый.

Асобнай праблемай у выкладанні сацыяльна-палітычных дысцыплін з'яўляецца пераадоленне вышэйадзначанных недэмакратычных стэрэатыпаў у свядомасці студэнтаў. У сувязі з гэтым адзначым 3 моманты, якія адпаведным чынам расстаўляюць акцэнты.

1) Неабходна дэмістыфікацыя улады - разглядаць яе не як звышсілу, якая стаіць над грамадствам, а крытычна аналізаваць яе як функцыю грамадства.

2) Неабходна дэперсаніфікацыя улады - перанесці акцент з аўтарытэта асобы на аўтарытэт права і дэмакратычных прынцыпаў, замяніць пакланенне асобе кіраўніка павагай да пасады і прававых норм.

3) Неабходна пераадоленне канфрантацыйнасці - плюралізм (рознасць думак, інтарэсаў, ідэалогій) трэба разглядаць неадрыўна ад адзінства грамадства (агульныя нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы, прававыя нормы).